Галіна ЛАЗІЦКАЯ

# Царыца Нябесная

Узнімаю я вочы ў блакітную просінь
І помысна думкі ў Нябёсы я шлю.
Душа мая ные, душа мая просіць
Пакрову Царыцы найперш за сям'ю.

Нябесная Маці! Царыца Нябесная!
Святым амафорам сям'ю затулі.
Прад Сынам Сваім пакорай уцешная
Трывожныя думкі мае замяні.

Заступніца, веру – Пакроў
Багародзіцы
За шчырасць малітвы і сілу ўвалье.
І страх за сям'ю, за дзяцей каб
не мроіўся,
Тваё суцяшэнне стрымае мяне.

Я знаю: усяляеш Ты добрае, светлае,
А ворагам лютым усяк думкі мае.
І цішшу нябеснаю напомніш
мне вечнае
У нудоце пакласціся зноў на Цябе.

І знімеш Ты цяжар, і жах мой
адступіцца,
Удзячнасці словы напоўняць мяне,
Царыца Нябесная, Святая
Заступніца,
Удзень, сярод ночы – я клічу Цябе.